ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.

ЧАЦВЕР

31

САКАВІКА

№ 10(1568)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## У наступным нумары чытайце

А на дварэ ўжо вясна. Час росквіту прыроды, жыцця, кахання.

І яшчэ час спорту. Бачылі, колькі прыхільнікаў бегу выходзіць раніцой на вуліцы? Заўважылі, як ажываюць спартыўныя пляцоўкі? Усе гэтыя прыкметы сведчаць аб адным: пачынаецца новы сезон.

Аб выніках спаборніцтваў, турыстычных падарожжаў і проста аб тых, для каго спорт — жыццё, раскавае старонка«ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ».

## Беларускі універсітэт ТЭЛЕТАЙП

*ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### ДНІ ФАКУЛЬТЭТАЎ

адкрые ФПМ першага красавіка.

— Што яны сабой уяўляюць? — пацікавілася я ў мастацкага кіраўніка студэнцкага клуба БДУ М. Тарасавай.

— Праграма дзён на кожным факультэце свая. Усё залежыць ад выдумкі, ініцыятывы, кемлівасці арганізатараў. Будуць праведзены прэс-канферэнцыі, конкурсы выкладчыкаў, выстаўкі плакатаў, з канцэртнымі праграмамі перад прысутнымі выступяць студэнцкія тэатры мініяцюр і г. д.

А. САЎЧЫК.

### УЗНЯЦЬ НАСТРОЙ

самому не заўсёды пад сілу. Але калі вы жадаеце гэтага, запрашаем вас сёння а семнаццатай гадзіне ў актавую залу галоўнага корпуса. Тут перад вамі выступяць удзельнікі клуба афарыстыкі, гумару і сатыры. У перапынку будзе працаваць кніжны кіёск, і вы зможаце, як кажуць, спалучыць прыемнае з карысным.

А. ШЭЛЕСТ.

### «ПАРАД НАДЗЕЙ-88»

прыцягне ўвагу многіх аматараў музычнага мастацтва. Ініцыятарам правядзення фестывалю стаў Рэспубліканскі маладзёжны музычны цэнтр, а пройдзе ён у Палацы культуры прафтэхадукацыі з 31 сакавіка па 3 красавіка. У ім прымуць удзел лепшыя ансамблі, рок-групы і выканаўцы рэспублікі.

Д. ВІЛЬКІН.

## Да камсамольцаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

16 мая 1985 года выйшла Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». У снежні гэтага ж года камітэт камсамола універсітэта прыняў адпаведны зварот да студэнтаў. Сёння мы можам сказаць, што значна скарацілася колькасць студэнтаў і супрацоўнікаў-камсамольцаў, якія ўжывалі спіртныя напіткі, з'яўляліся ў грамадскіх месцах у нецвярозым стане.

За тры гады амаль у чатыры разы знізілася колькасць студэнтаў, затрыманых у нецвярозым стане супрацоўнікамі міліцыі (1985 г.— 43 чалавекі, 1986 — 24, 1987 — 11 чалавек). Аднак фактаў ужывання спіртнога пакуль многа. У 1986—1987 гг. камітэтам камсамола разгледжана 35 персанальных спраў, звязаных з парушэннем антыалкагольнага заканадаўства. 24 чалавекі выключаны з радоў членаў ВЛКСМ і з ліку студэнтаў.

Не выкаранена традыцыя ўжывання спіртных напіткаў у інтэрнатах з выпадку розных свят, дзён нараджэння і г. д. Асабліва многа негатыўных з'яў у інтэрнатах № 2 і № 7.

Камітэт камсамола універсітэта не здымае з сябе адказнасці за недастатковую работу па прапагандзе і арганізацыі здаровага, цвярозага ладу жыцця. Магчыма, у некаторых выпадках мы падышлі не вельмі патрабавальна да ацэнкі учынкаў некаторых камсамольцаў. Таму яшчэ раз напамінаем, што ў адпаведнасці з загадам рэктара ад 24.05.85 г. «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы супраць п'янства і алкагалізму» паяўленне членаў нашага калектыву ў нецвярозым стане ў вучэбных карпусах, інтэрнатах і іншых грамадскіх месцах, а таксама прынос спіртнога ў інтэрнаты разглядаецца як сур'ёзны праступак, які ганьбіць званне студэнта ці супрацоўніка БДУ імя У. І. Леніна, несумяшчальны са знаходжаннем яго ў радах членаў ВЛКСМ і ва універсітэце. Камсамольскія арганізацыі груп, факультэтаў, студэнцкія саветы інтэрнатаў павінны ўзмацніць патрабаванні да членаў ВЛКСМ, схільных да ўжывання спіртнога».

Мэта нашай работы — не пакаранне вінаватых у п'янстве, а папярэджанне гэтай з'явы, яе поўнае выкараненне.

Кожны павінен зразумець, што ўжыванне алкаголю і званне савецкага студэнта, камсамольца — несумяшчальныя.

КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ І. У. ЛЕНІНА.



Вось і ўсе. Апошні экзамен можна забыць. Атрымана пяцёрка. Апошняя. Што чакае пяцікурсніцу ФПМ Жанну Міхайлоўскую наперадзе? Самастойнае жыццё. Але, зразумела, ужо ніколі не забудзецца вучоба ва універсітэце, дзе ўсе пяць гадоў яна была камсоргам групы, будуць помніцца і ўсе чатыры будатрады, у якіх яна працавала. Цікавымі, насычанымі былі гады. Не менш вабіць і шмат абяцае будучае жыццё.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

### «НЕПЕРАМОЖНЫ»

— гэты партрэт, адна з лепшых карцін народнага мастака СССР А. Шылава. Вось што пісаў сам аўтар у сваіх успамінах пра гэту работу: «9 мая 1982 г. Масква. Плошча Свярдлова. Сквер ля Вялікага тэатра. Квітнеючыя яблыні, бэз, яркае вясновае неба. Побач з майскай зелянінай — пунсовыя ленты баявых ордэнаў Вялікай Айчыннай, ззяючыя медалі на кіцелях, сівыя пасмы валасоў і надзіва маладыя вочы, поўныя душэўнага хвалявання. І раптам я убачыў свайго героя. Яго падцягнутая фігура, здавалася, яшчэ захавала армейскую выпраўку, а гордая постаць і хітрая ўсмешка гаварылі аб тым, што яго душа непадуладна гадам. Адчувалася, што ні вайна, ні час не зламалі яго характар — мужны, адкрыты, добры».

«Маці-гераіня», «Адна», «У чаканні», «Халадае» — няпоўны пералік карцін, якія творца прысвяціў жанчыне. Асобная група работ — партрэты лётчыкаў-касманаўтаў, за якія мастак атрымаў прэмію Ленінскага камсамола СССР.

З гэтымі і іншымі старонкамі жыцця і творчасці вядомага мастака пазнаёмілі студэнтаў мехмата супрацоўнікі аддзела масавай работы бібліятэкі ў час агляду «А. Шылаў — народны мастак СССР».

З. МІХНЕВІЧ.

РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

## Каб пазбавіцца ад ілюзій

УЖО ЎСІМ, напэўна, абрыдла слухаць і гаварыць пра тое, што п'янства — загана, з якой трэба бязлітасна змагацца, якую неабходна выкарчоўваць.

Але размовы размовамі, а на справе... У нас, на сорам, яшчэ не перавяліся аматары асушыць чарку з нагоды і без яе. Пасля — мора па калена: можна у п'яным выглядзе з'явіцца ў грамадскім месцы, пахуліганіць... а потым адпачыць у медвыцвярэзніку. Дарэчы, у ім у мінулым годзе пабывала 14 чалавек — студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта. Гэта амаль утрая больш, чым у 1986 годзе. Пакаянне, безумоўна, наступіць. Толькі запозненае. Калі ўжо зробленага не вернеш, механізм прыйшоў у рух: паведамленне аб правапарушэнні з міліцыі даслана, неабходна прымаць меры. А такіх непрыемных допісаў у 1987 годзе (усе даныя ў артыкуле за мінулы год) атрымана 44, на два больш, чым у папярэднім. Відаць, правільныя вывады не зроблены. На першым месцы па колькасці непрыстойных учынкаў супрацоўнікі універсітэта, на другім — студэнты. Ёсць, хоць і не так многа, выкладчыкі.

Стараюцца дагнаць у гэтай справе савецкіх студэнтаў замежныя. У параўнанні з 1986 годам колькасць правапарушэнняў, звязаных з п'янствам, сярод замежнікаў падвоілася. Аказваецца, не толькі азы навукі спасцігаюць яны тут.

Так, становішча, прама скажам, не з лепшых. Адна з прычын у тым, што дрэнна наладжана ў нас антыалкагольная прапаганда, аслаблена каардынацыя дзеянняў грамадскіх фарміраванняў па выкараненню п'янства. Да такога вываду прыйшлі і члены бюро партыйнага камітэта, якія на сваім чарговым пасяджэнні разглядалі ход выканання патрабаванняў антыалкагольнага заканадаўства і пастановы бюро парткома ад 24 чэрвеня 1987 года па гэтаму пытанню.

Спакусу выпіўкі трэба прыбраць з дарогі. Адначасова пераконваць, што алкаголь — той жа опіум, значыць, яму не месца ў нашым жыцці, ён лішні на нашай зямлі. Настрой чалавека на цвярозасць — вялікая сіла, толькі яна павінна падмацоўвацца многімі фактарамі, інакш ёй пагражае паражэнне. Не кожны мае вялікую вытрымку, моцную сілу волі, мэтанакіраванасць, якія б дапамаглі яму не паддавацца спакусе, выстаяць і абараніць добрыя ўсходы ў сваёй душы. Такі чалавек знаходзіцца ў палоне ілюзій. І ўпэўніць яго ў адваротным абавязаны мы з вамі. У гэтым павінны бачыць сваю асноўную задачу члены савета па прававому выхаванню і прафілактыцы правапарушэнняў БДУ імя У. І. Леніна.

Для паляпшэння прафілактычнай работы саветам арганізавана лекцыйная група з ліку студэнтаў старэйшых курсаў юрыдычнага факультэта. Стараюцца добраахвотныя памочнікі: праводзяць гутаркі, чытаюць лекцыі на прававыя тэмы ў студэнцкіх групах, на курсах. Гэтага, на жаль, нельга сказаць пра супрацоўнікаў кафедры марксісцка-ленінскай этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму. З 435 лекцый, прачытаных членамі кафедры, толькі 16 былі ва універсітэце і то па тэматыцы, не звязанай з прапагандай цвярозага ладу жыцця: «Эстэтычнае выхаванне на ўроках матэматыкі», «Аб сэнсе жыцця». Магчыма, ім здаецца, што гэта непатрэбная справа? Толькі жыццё пераконвае ў адваротным: п'янства, як і хваробу, лягчэй папярэдзіць.

Усё з тых жа меркаванняў (узмацненне прафработы) у кожным падраздзяленні створаны камісіі па барацьбе з п'янствам. Але пакуль яны так і не змаглі вызначыць кола сваіх абавязкаў, каб не дубліраваць дзейнасць савета прававога выхавання. У некаторых эталонам выдатнай работы стала колькасць праведзеных пасяджэнняў. А другія гэта ў разлік не бяруць, як, напрыклад, камісія па барацьбе з п'янствам СКТБ з доследнай вытворчасцю. Іх актыўнасць вызначаецца тым, што правялі (на дзень праверкі камісіяй парткома) адно пасяджэнне... па зацвярджэнню плана работы, які носіць надта агульны характар. Нездарма колькасць правапарушэнняў, звязаных з п'янствам, тут застаецца высокай.

Думаецца, камісіі па барацьбе з п'янствам павінны ўшчыльную заняцца распрацоўкай і правядзеннем мерапрыемстваў па папярэджанню выпадкаў ужывання алкаголю сярод работнікаў універсітэта, выхоўваць іх шляхам перакanання і грамадскага ўздзеяння. А вось ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва і каардынаваць прафілактычную работу добра было б савету па прававому выхаванню.

Ёсць у нас і добраахвотнае таварыства барацьбы за цвярозасць, якое аб'ядноўвае 2286 членаў. Яны таксама спрабуюць нешта рабіць: чытаюць лекцыі на антыалкагольную тэматыку, афармляюць наглядную агітацыю, займаюцца арганізацыяй адпачынку, пошукам новых, эфектыўных форм антыалкагольнай і прапагандысцкай работы. Толькі ці не надта зацягнуўся гэты пошук?

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ХУТКА НА ЎСІХ ФАКУЛЬТЭТАХ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПАЧНЕЦЦА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ. СЕННЯ ІДЗЕ АКТЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ДА ЯЕ: ПРАВОДЗІЦЦА ВУЧОБА КАМСОРГАЎ ГРУП, ВЫЗНАЧАЕЦЦА ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ... НАМЕСНІК САКРАТАРА КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА ПА ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОЦЕ С. БАЛАШЭНКА ПЕРАКАНАНЫ: АТЭСТАЦЫЯ АБАВЯЗКОВА ПАКАЖА, МАЕ ПРАВА СТУДЭНТ БЫЦЬ КАМСАМОЛЬЦАМ ЦІ НЕ.

## ГПА: НАПЯРЭДАДНІ ПРАВЯДЗЕННЯ

# ПАЦВЕРДЗІЦЬ ЗВАННЕ

— Сяргей, якую задачу ставіць перад сабой камітэт камсамола, праводзячы грамадска-палітычную атэстацыю студэнтаў?

— ГПА з'яўляецца адным з метадаў фарміравання ў студэнтаў камуністычнай перакананасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі, выхавання пачуцця грамадзянскай адказнасці. Яна заклікана спалучаць у сабе кантралюючую і ацэначную функцыі, садзейнічаць павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню.

— Ці змяніўся парадак правядзення ГПА?

— У гэтым годзе ўпершыню грамадска-палітычная атэстацыя пройдзе на працягу навучальнага года. У акадэмічных групах ствараюцца атэстацыйныя камісіі. У іх састаў уваходзяць члены камсамольскага бюро групы і прадстаўнік камітэта камсамола факультэта. Атэстуемы трымае перад камісіяй справаздачу аб рабоце за год, потым адказвае на пытанні групы і членаў камісіі.

— А па якіх крытэрыях ацэньваецца работа камсамольцаў?

— На першым месцы, безумоўна, вучоба. Для студэнта гэта галоўнае. Прычым улічваюцца не толькі вынікі сесіі, але і актыўнасць на семінарах і практычных занятках. Немалаважнае значэнне мае і наведванне лекцый. Наступны крытэрый — навуковая работа.

Самая сур'ёзная ўвага надаецца членамі камісіі грамадскай дзейнасці. Тое, што студэнт мае якое-небудзь даручэнне, не самае галоўнае. Важна, каб выконвалася яно добрасумленна, своечасова і каб пры гэтым праяўлялася ўласная ініцыятыва.

Прынцыпова будзе ацэньвацца і грамадска карысная праца — удзел у будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадах, работа піянерважатымі ў загарадных піянерскіх лагерах, актыўнасць на суботніках. І, нарэшце, арыентацыя ў пытаннях унутранай і знешняй палітыкі.

— Існуюць дзве формы правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі: па бальнай сістэме і па прынцыпу «атэставаны» — «не атэставаны».

— Так, у першым выпадку рыхтуецца ведамасць, у якую ўключаюцца ўсе вышэйназваныя пункты. Члены атэстацыйнай камісіі тайна выстаўляюць атэстуемаму ацэнку — ад нуля да дзесяці балаў па кожнаму крытэрыю. Пасля чаго падлічваецца сярэдні бал у кожнай графе ведамасці і выводзіцца агульная сума. Прынамсі, яна павінна быць не ніжэй 25 балаў, у адваротным выпадку камсамолец не атэстоўваецца.

Калі выбрана другая форма, то пасля справаздачы камсамольца і адказу на пытанні атэстацыйная камісія (у яго адсутнасць) галасаваннем вырашае: атэставаны ён ці не.

— Якую з названых форм атэстацыі ты рэкамендаваў бы камітэтам камсамола факультэтаў?

— Катэгарычна адказаць на гэта пытанне нельга. На маю думку, перавага бальнай сістэмы ў тым, што яна стварае пэўную дыферэнцыяцыю ў адносінах да кожнага камсамольца. А якая форма лепшая і больш перспектыўная, пакажа сёлетняя ГПА.

Хацелася б толькі сказаць вось што. Магчыма, у камсамольцаў ёсць якія-небудзь прапановы па правядзенню атэстацыі, у камітэце камсамола універсітэта вас з цікавасцю выслухаюць. Самыя слушныя заўвагі будуць абавязкова выкарыстаны ў будучым.

— А калі атрымаецца так, што членам атэстацыйнай камісіі спатрэбіцца трацейскі суддзя. Хто ім будзе?

— Такое можа здарыцца. Калі члены камсамольскага бюро групы і прадстаўнік камітэта камсамола факультэта не прыйдуць да адзінай думкі аб атэстацыі студэнта, то пытанне можа быць вынесена на пасяджэнне камітэта камсамола універсітэта.

— Уявім такую сітуацыю: камсамольцы і члены бюро групы выканалі сваю асноўную задачу — былі прынцыповымі, бескампраміснымі да сваіх таварышаў. І вырашылі: гэты — лайдак, дрэнна вучыцца, неактыўны, не ўдзельнічае — не можа быць атэставаны...

— У такім выпадку будзе разглядацца персанальная справа камсамольца і выносіцца пакаранне ў адпаведнасці са Статутам ВЛКСМ. І ўсё ж хочацца верыць, што кожны камсамолец пацвердзіць, што ён не выпадкова носіць гэта высокае званне.

Інтэрв'ю правяла
З. АЛЯКСАНДРАВА.

## ПЫТАННЕ РУБАМ

# ТРЭШЧЫНА

Будынак універсітэта даў трэшчыну. Не ўсміхайцеся. Тут не да жартаў.

Спачатку на ціхенькае рыпенне, што даносілася невядома адкуль (людзі неадукаваныя адразу знайшлі б яму тлумачэнне, спісаўшы ўсё на дамавіка ці якога лешака, але ж дзеянне адбывалася ў вышэйшай навучальнай установе, дзе над такімі выдумкамі толькі пасмяяліся б, ніхто асаблівай увагі не звяртаў.

Яно і зразумела: кожны займаўся сваімі справамі, што патрабавалі неадкладнага выканання. Адны старанна пісалі канспекты і добрасумленна слухалі лекцыі (у такім выпадку пабочным гукам у сумленне не пранікнуць), другія складалі графік спаборніцтва паміж камсамольскімі групамі і прыстасоўвалі на сцяну стэнд (тым больш за грукатам малаткоў нічога не заўважылі), іншыя...

З часам рыпенне набыло пагрозлівае гучанне. Нарэшце, нарадзілася першая трэшчына. З цікавасцю зірнула яна ў свет і... Што тут пачалося! Затрашчаў па швах не ў пераносным — у прамым сэнсе галоўны корпус ад першага да шостага паверха. На вачах у выкладчыкаў, студэнтаў, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і іншых служб універсітэта.



Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

— А мы ўжо і не заўважаем,— запэўнілі ў расколатым на дзве часткі камітэце камсамола механіка-матэматычнага факультэта.— Нават не памятаем, калі з'явілася.

— Ну што вы! Гэта ж не паказальная трэшчына,— пачалі пераконваць супрацоўнікі музея гісторыі універсітэта і, паназіраўшы за тым, як старанна даследуем мы сцены, прапанавалі незвычайную экскурсію на тэму «Трэшчына».

Калі паслухаць аптымістычны расказ дырэктара музея Аляксандра Мікалаевіча Плавінскага, можа скласціся ўражанне, што ніякай шкоды яму трэшчыны не прыносяць: «Вось вам яшчэ адна, свежанькая і даволі сімпатычная. Вось самая прыгожая...»

Але гэта толькі знешне. На самай справе не даюць яму спакойнага жыцця гэтыя трэшчыны і прыносяць нямала клопатаў:

— Зверху сыплецца пастаянна. Таму і даводзіцца супрацоўнікам кожную раніцу праціраць вітрыны. І ўсё роўна, хіба гэта выйсце. Аднойчы адваліўся вялізны кусок тынкоўкі. Пакуль што на падлогу.

А гэта бачыце? Рушылі з месца вітрыны. Добра, што шкло паспелі выняць: давялося б шукаць новае. Трашчаць ужо не толькі сцены, зірніце на падлогу. Праўда, дзверы пасля таго, як дала яна трэшчыну, пачалі расчыняцца, раней толькі рыпелі.

Але ж хлопцы-метрабудаўцы паабяцалі: «Калі ў лютым нічога не здарыцца, жыць будзеце». Жывём-такі.

«Магчыма, нічога не здарыцца, хіба толькі дробязі якія»,— раздорваюць спадзяванкі ва ўпраўленні «Мінскметрабуд».

Вось калі б не гэта няўпэўненае «магчыма» ды не дробязі накшталт неэстэтычнага выгляду аўдыторый і тынкоўкі на падлозе і сталах, «танцуючай» падлогі на шостым паверсе і папорчаных вітрын музея, гаворку аб трэшчыне (дарэчы, яна ўжо не адна, таму пяройдзем на множны лік) можна было б не пачынаць.

Каб не склалася ўражанне, што непакоіць гэтая праблема толькі тых, да каго трэшчыны бліжэй, прапануем вам невялікае інтэрв'ю з начальнікам аддзела тэхнічнай эксплуатацыі І. А. КАВАЛЕЎСКІМ і некалькі дакументальных пацвярджэнняў таго, што службы адміністрацыйна-гаспадарчай часткі трымаюць пытанне на кантролі.

— Калі ж мы забілі трывогу, Ігар Аляксандравіч?

— Першыя трэшчыны з'явіліся яшчэ ў час будаўніцтва асноўнай лініі метро. Старажылы універсітэта могуць вызначыць дакладна. Я ж спачатку ўбачыў, як пачаў правальвацца асфальт ля будынка універсітэта. Звярнуўся да будаўнікоў метро. «Магчыма, талыя воды, вясна ж на двары»,— адказалі там. Потым, калі давялося сустрэцца яшчэ некалькі разоў, даведаўся: пад будынкам праводзяць тунель.

— І першыя меры...

— Былі неадкладна прыняты. На сценах з'явіліся своеасаблівыя барометры далейшых парушэнняў — «маякамі» клічам мы іх. Усе паказчыкі запісваем у асобны журнал, каб папярэдзіць бяду раней, чым яна да нас прыйдзе. Хоць трэшчыны гэтыя непагражальнага характару.

ДЛЯ ДАВЕДКІ. Яшчэ ў снежні мінулага года ўпраўленне «Мінскметрабуд» атрымала паведамленне аб тым, што «у выніку работ на тэрыторыі універсітэцкага гарадка ў знешніх сценах правага крыла галоўнага корпуса з'явіліся трэшчыны, якія ахапілі ўсе паверхі», і пісьмовую просьбу забяспечыць бяспечнае вядзенне работ пад будынкам корпуса.

— Папрацавалі ў нас і супрацоўнікі інстытута экспертызы.

ДЛЯ ДАВЕДКІ. У студзені, пасля правядзення камісійнага абследавання, з'явілася патрабаванне: «Тэрмінова спыніць вядзенне работ для вынясення заключэння адпаведнай камісіяй СКТБ ІСІА і правесці рамонт у памяшканнях галоўнага корпуса сіламі БМУ-2».

А тэхнічная нарада (такіх было тры за гэты год) вырашыла: «БМУ-2 УБ «Мінскметрабуд» і Мінскметрапраекту да 07.01.88 г. распрацаваць мерапрыемствы для папярэджання далейшага развіцця дэфармацыі будынка пры праходніцкіх работах, БМУ-2 устанавіць за будынкам штодзённы маркшэйдэрскі кантроль, УБ «Мінскметрабуд» прыцягнуць спецыялізаваную арганізацыю для правядзення тэхнічнага абследавання канструкцый будынка галоўнага корпуса БДУ». Паабяцала нам упраўленне і рамонт пасля заканчэння падземных работ.

Такім чынам, пытанне застаецца на кантролі. Ці дачакаемся яго вырашэння?

М. ПАРХІМОВІЧ.
ЧЛЕНЫ ШТАБА
«Камсамольскага
пражэктара».

## НАТАТКІ НАЗІРАЛЬНІКА

# ГАНДЛЯРЫ ШЧАСЦЕМ

Мая субяседніца — дзяўчына маладая і прыгожая. З горам напалову скончыла восем класаў. Нідзе не працуе. Затое варажыць умее з тае пары, як памятае сябе. Яна — цыганка.

Падыходзіць да астатніх празорліўцаў, варожа пазіраўшых на нас, я не адважылася. Не толькі таму, што прыняла да ведама параду чарнавокай незнаёмкі, але і таму, што засталіся горкія ўспаміны з абітурыенцкіх часін.

Гэты выпадак усхваляваў увесь інтэрнат. Абвялі вакол пальца неразумную дзяўчыну цыганкі, паказаўшы немудрагелісты фокус, у выніку якога з сумачкі зніклі ўсе грошы. І не так прыкра было б, каб нейкі злодзей выкраў, дык сама ж спрытненька ўсё, да апошняга рубельчыка, аддала варажбітцы. Як зачараваная, глядзела яна на сімпатычную чараўніцу, слухаючы апошнія словы:

— Не хвалюйся, дачушка. Убачыш ты раніцой свае грошы ў тумбачцы.

Тады дзяўчынка яшчэ верыла, што цуд існуе не толькі ў казках. І не ведала, што і ў жыцці сустракаюцца ліхія чарадзеі уласнай нажывы.

Трэба заўважыць, сапраўдныя псіхолагі гэтыя варажбіткі. Ведаюць, у каго што на сэрцы, як падысці, як пачаць размову. І здараецца (сумна, што не так ужо і рэдка), знаходзяць ахілесаву пяту: у каго гэта — жаданне зведаць цуд, у іншага — імкненне да вечнага шчасця.

...Ідзе жанчына. Адразу зразумела, што нешта вельмі ўсхвалявала яе, бо на вачах — слёзы. Нікога не заўважае. А з натоўпу за ёй ужо сочаць чарнявыя вочы. Шпарка набліжаецца да яе цыганка. Хапае за руку. Падыходжу бліжэй і чую ліслівы голас:

— Ты ж такая маладая яшчэ! Хочаш ведаць, хто цябе кахае, хто замуж возьме? Пазалаці ручку — пра ўсе радасці раскажу, што чакаюць уперадзе...

Спачатку няўпэўнена, а потым з зацікаўленасцю зірнула жанчына на шчодрую гандлярку шчасцем і з надзеяй запыталася: «Сапраўды?»

Тут ужо цыганка заклікала на дапамогу ўсё сваё красамоўства. Зразумець можна было толькі адно: жыццё будзе такім бясхмарным і бесклапотным, што нельга шкадаваць зараз грошы на яго моўнае ўпрыгожванне.

З прадказальнікамі шчасця нялёгка змагацца.

— Даўно ўжо мы іх тут бачым. Але ж гуртам яны: да адной дакранешся — другія на дапамогу прыйдуць,— паскардзіўся неяк знаёмы міліцыянер.

Сапраўды, што ў такім выпадку могуць зрабіць ахоўнікі парадку? Забраць гадалку ва ўчастак, пагутарыць, а калі знойдуцца сведкі (што бывае вельмі рэдка, бо нават пацярпеўшыя імкнуцца хутчэй знікнуць), саставіць акт. А заплаціўшы дзесяць рублёў штрафу, празорліўцы з падвоенай энергіяй прымаюцца за «працу». На жаль, колькасць жадаючых зазірнуць у будучыню не памяншаецца. Фантазіраваць і марыць аб шчасці нікому не забараняецца. Але ці не зручней будаваць жыццё без дапамогі цыганак? Не чакаць, пакуль прынясуць яны ў падарунак суджанага: сур'ёзна рыхтавацца да экзаменаў, а не спадзявацца на шчаслівыя прадказанні.

— Паспрабуем? — прапанавала я неяк сяброўцы.

— Зразумела, без цыганак абыдземся,— пацвердзіла яна.— У суседнім пакоі, ведаеш, як адна дзяўчына на картах варожыць...

Яна па-ранейшаму займае месца ў чарзе шукальніц лёгкага шчасця.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

Асаблівы клопат — малады камуніст

# КАГО Ж ГЭТА ДАТЫЧЫЦЬ?

**Сярод студэнтаў юрыдычнага факультэта кожны восьмы з'яўляецца камуністам. Гэты вялікі атрад уключае ў сябе 93 члены партыі і 17 кандыдатаў, што складае 12 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў факультэта.**

Пераважная большасць камуністаў юрыдычнага факультэта імкнецца быць наперадзе і ў вучобе, і ў грамадскім жыцці, як студэнты-выпускнікі А. Дземяшкевіч, Д. Гарачка, І. Бяляўская, А. Маймусаў і іншыя. Паспяхова спалучае выдатную вучобу з грамадскай работай член партыйнага бюро факультэта А. Кацабурава. Актыўную пазіцыю ў вучобе і грамадскай рабоце займаюць студэнты малодшых курсаў І. Верхаводка, І. Цывінская, А. Літвінін і многія іншыя. Шэсцьдзесят дзевяць студэнтаў-камуністаў на факультэце вучацца на «добра» і «выдатна», характэрна і тое, што ўсе яны добрыя грамадскія работнікі: актыўнасць праяўляюць у рабоце ДНД, аператыўных атрадах, з'яўляюцца грамадскімі памочнікамі работнікаў праваахоўных органаў.

У Палітычным дакладзе ЦК XXVII з'езду КПСС адзначалася, што не бывае авангарднай ролі камуністаў наогул, яна выражаецца ў канкрэтных справах. Статут КПСС прад'яўляе да члена партыі патрабаванне быць прыкладам у працы. Для студэнта асноўнай формай працы з'яўляецца вучоба, атрыманне ведаў, неабходных для будучай прафесійнай дзейнасці.

Нядаўна на факультэце адбыўся партыйны сход, на якім абмяркоўвалася роля студэнта-камуніста ў вучобе, працы, грамадскай дзейнасці, іншымі словамі, на парадку дня стаяла пытанне аб укладзе кожнага камуніста ў перабудову. Тут і вызначылася, што далёка не ўсе яны аказаліся на вышыні патрабаванняў і рашэнняў з'езда і Статута. Так, у зімовую сесію 22 студэнты атрымалі па адной і болей здавальняючых адзнак, а 5 — і зусім нездавальняючыя. На IV курсе кожны другі камуніст аказаўся троечнікам. Узнікае пытанне: «А дзе перабудова?» Але ж справа перабудовы вышэйшай школы адбываецца штодзённа — удасканаленне вучэбнага працэсу, скарачэнне вучэбнай нагрузкі, студэнцкае самакіраванне, вучоба па індывідуальнаму плану. Усё гэта павінна садзейнічаць павышэнню ўзроўню ведаў. На жаль, многія студэнты аказаліся да гэтага не гатовымі. Характэрна, што некаторыя камуністы ў ходзе грамадска-палітычнай атэстацыі на пытанне аб іх асабістым удзеле ў перабудове адказвалі прыкладна так: «Што нам перабудоўвацца? Мы толькі ўступаем у жыццё, і нічога, што патрабавала б выпраўлення, зрабіць не паспелі». А ў думках яны, мусіць, так лічаць: «Гэта вы, маўляў, у застойны перыяд нарабілі спраў, вы і перабудоўвайцеся. А нас гэта не датычыць. Мы вучымся не горш за іншых, паводзім сябе добра, і гэтага дастаткова».

Выступіўшыя на сходзе, камуністы асудзілі такі настрой, рэзка крытыкавалі тых, хто далёка ззаду застаецца ў вучобе, займае пасіўную пазіцыю ў грамадскім жыцці.

Камуністы ўнеслі і рад цікавых прапаноў. У пастанове партыйнага сходу запісалі: «Прапанаваць дэканату юрыдычнага факультэта абмеркаваць пытанне аб магчымасці прадастаўлення студэнтам права наведваць па свайму выбару лекцыі выкладчыкаў, якія чытаюць аналагічны курс на другім патоку, а таксама аб прадастаўленні права студэнту падрыхтоўваць рэферат на тэму, прапанаваную самім студэнтам».

**В. ЛАГОЙСКІ,**
**член партыйнага бюро юрыдычнага факультэта, выкладчык.**



Б'ем трывогу!

# ЧАСОВАЯ ПРАПІСКА

**Нават пад аховай шкляной вітрыны, у акружэнні старых знаёмых, пры матавым пяшчотным святле лямп Жар-птушка выглядала безабароннай. Прыгажэйшая за іншых, яна імкнулася сарвацца з месца, зашыцца ў кут, хаваючы яркае апярэнне. І не магла: развучылася лятаць.**

**З тае пары, як пачало існаваць навуковае азначэнне чалавечых злачынстваў у прыродзе — антрапагенны фактар, Жар-птушка перасялілася ў музей. Але і тут цёмныя пацеркі яе разумных вачэй жывуць пужаючым прадчуваннем новай бяды.**

**Яны ўсе: звычайны заяц і (асаблівая гордасць) імператарскі пінгвін, чорны грыф і трапічныя насякомыя, гімалайскі мядзведзь і пітон вось ужо некалькі гадоў знаходзяцца пад пагрозай быць знішчанымі, пакалечанымі ці наогул забытымі ў час наступнага пераезду універсітэцкага заалагічнага музея.**

Пакідала музей з супярэчлівымі пачуццямі. Ніколі яшчэ (нават у заапарку) не сустракала такой разнастайнасці відаў жывёл і птушак. Тое, што паспела ўбачыць, было толькі невялікай часткай, якая экспануецца ў залах музея і стваралася для пазнавальных мэт. Асноўнай жа для любога музея, растлумачылі мне, з'яўляецца іншае — калекцыя. У вялікай ступені цікавіць яна тых, хто займаецца навуковай работай. Усё разам складае значную лічбу — каля 9 тысяч экспанатаў.

Любавалася рознакаляровасцю, здзіўлялася разнастайнасці і непаўторнасці, паўтарала, каб не забыцца, назвы... А зачыніўшы дзверы, змагла аднавіць у памяці толькі тое, што ў час экскурсіі псавала настрой: разабраныя вітрыны, якія стаяць у калідоры, бо пры дадзеных плошчах не да іх, ды дзве казулі, што прытуліліся адна да адной зусім не па прыроджанай пужлівасці — зноў жа з-за недахопу месца.

Слухала цікавыя расказы дырэктара музея Аляксандра Дзмітрыевіча Пісаненкі і побач з ноткамі гордасці і любасці прыкмячала вінаватыя: «Выбачайце, што не паказваю апошнюю залу — да гэтае пары разбіраемся пасля чарговага пераезду», разгубленыя: «Хіба ж утрох усё паспееш? Да таго ж, памяшканне зноў толькі часовае», пакрыўджаныя: «Пакуль паднялі ўсё на другі паверх, пашкодзілі многія экспанаты. Давялося аднаўляць каля пяці працэнтаў. І калі б у апошні раз!»

Скаргаў я не чула, але нават у бадзёрым тоне адчувала стомленасць ад жыцця ў прадчуванні новага пераезду, ад бясконцага змагання за метры і нястрачаных яшчэ надзей: «Ведаеце, зараз амаль у кожным заамузеі ствараюцца ландшафтна-экалагічныя кампазіцыі, дыярамы, біягрупы. Нам для гэтага неабходна павялічыць плошчу ўтрая, мы ж з цягам часу, наадварот, усё меншаем».

Заалагічны музей універсітэта існуе ўжо больш за 60 гадоў. Гэта яго лічаць самым буйным у Беларусі па колькасці экспанатаў. Называюць у розных дакументах то вучэбна-навуковым, то навукова-асветніцкім падраздзяленнем, а часам гучыць і вось такая пачэсная назва — дзяржаўнае сховішча помнікаў прыроднай гісторыі. Калі сказаць проста — гэта база для вучэбнай і навукова-даследчай работы студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў універсітэта і іншых арганізацый.

У ім сабраны віды, якія сустракаюцца ў лясах і палях усіх прыродных зон свету. Аснову ж складаюць матэрыялы, сабраныя экспедыцыяй 1923-26 гадоў пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры заалогіі, прафесара А. В. Фядзюшына. Частка экспанатаў трапіла ў залы ў выніку абмену паміж музеямі Індыі, Мексікі, Бразіліі і іншых краін свету. Не раз дэманстраваліся многія з іх на выстаўках: у Плоўдзіве, Лондане, на ВДНГ СССР.

Усё так. І сэнс існавання музея яго супрацоўнікі бачаць у развіцці прыродазнаўчых навук, паляпшэнні экалагічнай адукацыі і выхавання. Толькі вось у адной з даведак знайшла я і такія непрыемныя радкі: «Рост паступленняў музея стрымліваецца не столькі адсутнасцю відаў у прыродзе, колькі немагчымасцю размясціць і паўнацэнна паказаць гэтыя аб'екты з нагоды недахопу плошчаў».

Аднойчы адзін дасціпны знаёмы Аляксандра Дзмітрыевіча прыдумаў неблагі жарт, празваўшы яго дырэктарам склада шкур і касцей. І быў задаволены трапным выразам.

Ён памыляўся. Усё менш відаў застаецца ў прыродзе. І калі няма магчымасці сустрэцца з імі ў лесе, што дапаможа? Экспазіцыя музея. Таму часта наведваюцца сюды школьнікі. Прыязджаюць студэнты тэхналагічнага, медыцынскага, педагагічнага інстытутаў. Нярэдка звяртаюцца за дапамогай і работнікі кінастудыі «Беларусьфільм». Калі б і сапраўды не было нікому справы да экспанатаў, не наведваў бы універсітэцкі музей заезджы арнітолаг з Дрэздэна. А ён, дарэчы, толькі для таго і прыязджаў у Савецкі Саюз, каб папрацаваць у музеі.

Так, ён памыляўся.

І ён меў рацыю, гэты дасціпны знаёмы. Бо многія студэнты і супрацоўнікі універсітэта ведаюць пра музей толькі па чутках, а іншыя і наогул робяць «круглыя» вочы, пачуўшы пра яго. А з другога боку: хто пажадае ехаць наведваць музей некуды на «камчатку»? Толькі той, каму вельмі патрэбна. Бо да гэтага часу застаецца музей кафедральным і таму, існуючы ў якасці кабінета, не мае сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы. Бо не надта ахвотна ідуць на факультэце на афармленне экспедыцый, а паступленні павінны быць не стыхійнымі, а планавымі. Няма даведніка аб залах музея і нельга яго выдаць, таму што пастаяннай прапіскі ніводны экспанат музея не мае. Трыццаць гадоў знаходзіўся музей на геафаку, у 1980 годзе прыехаў у Шчамысліцу. Толькі разабралі экспанаты, стварылі экспазіцыі (дарэчы, папрацаваць давялося дастаткова, бо ні вентыляцыі, ні добрай падлогі не было, а ў заалагічным музеі павінен быць створаны асаблівы мікраклімат). А потым аказалася: не сваё месца занялі, адміністрацыя ж тым часам чакала сапраўдных гаспадароў — ЭВМ. Было вырашана перасяліць кватарантаў у падвал (!) СКТБ. Але знайшлося-такі памяшканне — невялікае (ні ў адну з чатырох залаў не можа зайсці нават адна экскурсійная група ў пятнаццаць чалавек), затое больш-менш прыдатнае.

І кожны раз у час гэтых падарожжаў экспанаты вымушаны былі «прывыкаць» да новых месц.

Нарэшце, можна лічыць, што і самога музея няма — вось ужо год, як вядзецца ўсталяванне (зноў жа на кароткі час: чакаецца новы пераезд), і наведвальнікі сюды амаль не прыходзяць, а ролю экскурсаводаў выконвае зусім іншая «штатная адзінка» — Зоя Леанідаўна Людвіг, старшы прэпаратар.

Так што справа трымаецца пакуль на энтузіязме.

Мне паказалі пустую вітрыну, што стаяла раней у калідоры корпуса. Яе жыхары зніклі адтуль па віне невядомых. Такія штукі прынята лічыць злачынствамі. Толькі, каб быць вінаватым, не абавязкова нешта псаваць уласнымі рукамі. Можна проста закрыць вочы, адвярнуць галаву ў бок, процілеглы Шчамысліцы. І нічога не выпраўляць.

...Жар-птушка — мара чалавека аб чароўнай прыгажосці не адразу зрабілася казачным персанажам. Спачатку жыла яна на волі і ў Беларусі насіла звычайнае імя — сізаваронка. Паспрабуйце знайсці яе дзе-небудзь у наш час.

Аксіёмы доказу не патрабуюць.

Без крылаў птушка не зможа адарвацца ад зямлі. У час барацьбы з «аб'ектыўнымі» абставінамі страчваецца пакрысе вера ў энтузіязм. Пры агульнай бесклапотнасці і няпамятлівасці музей ператвараецца ў склад знішчаных рэчаў. Без сустрэч з прыроднай прыгажосцю знікае як асоба сам чалавек. Можа здарыцца, праз колькі гадоў і слова «птушка» атрымае прапіску толькі ў казцы. І будзе незразумелым для дзяцей. Я жадаю, каб гэтыя аксіёмы былі абвергнуты. Таму што я супраць таго, каб такое здарылася з маім ці вашым сынам.

**З. МАРАВА.**




# З ДНЁМ СМЕХУ ВАС, СЯБРЫ!

НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЛЯ ЖАРТУ

## МЫ ЎСЕ ВУЧЫЛІСЯ ПАТРОХУ...

БАСП — гэта біялагічнае агенцтва [illegible]ацыйных паведамленняў. БАССД — біялагічнае агенцтва сацыяльна-статыстычных даследаванняў. У нядаўнім часе па ініцыятыве рэдкалегіі факультэцкай газеты «Vita» яны былі створаны на біяфаку.

І вось БАСП і БАССД, узяўшы на плячо «Рэпарцёр», выйшлі на вуліцы горада, каб правесці сваё першае даследаванне.

Сустрэчным яны задавалі такія пытанні:

*а) Што такое вірус?*
*б) Што такое бялок?*
*в) Што такое мутацыі?*

Рэакцыя на пытанні была самай рознай.

*Маладая жанчына:* «Ды вы што! Я — з Ленінграда! Добра, адкажу:

а) Інфекцыя.

б) Я тэхнічную ВНУ скончыла. Вось як я разумею: яйка, кальмары, крэветкі.

*Салідны мужчына на прыступках кансерваторыі:*

а) Малекула бялку.

б) Цяжка сказаць.

в) Ламанне голасу.

*Мужчына ў каракулевай шапцы.*

Яму пытанне (іншы раз умешваліся пытанні-паразіты):

— Што такое ДНК?

— Не спыняючыся, як хочаш можна расшыфраваць... І наогул мяне чакае машына.

Студэнтка IV курса біяфака БДУ:

б) Э-э-э... Я, наогул, сама біёлаг. Зараз паспрабую сфармуляваць азначэнне (каля 10 мінут)... Спарадкаваны ланцуг амінакіслот.

Дзве студэнткі педінстытута.

Ім пытанне:

— Што такое хларафіл?

— Ну, гэта... чым травяць каго-небудзь.

Спадарожнік студэнтак:

б) А бялок — не жаўток. І ўвогуле у мяне сябар кухар. Ён вам растлумачыць.

І гэтак далей. Такім жа чынам. Але нягледзячы на ўсе перашкоды, мы апыталі больш сотні чалавек. Спадзяемся, вынікі будуць станоўчыя... Дарэчы, а як вы, паважаныя чытачы, адказаце на гэтыя пытанні?

НАТАТКІ НАЗІРАЛЬНІКА

## Чаго не пазбегнуць

— Такім чынам, Пятроў, віншую вас з паспяховай абаронай дыпломнага праекта. Мы параіліся і вырашылі накіраваць вас...

— Не магу я туды ехаць!

— Ну чаму? Гэта ж 73-я паралель, паўночнае ззянне, паветра — галава закружыцца.

— Вось іменна.

— Ну, няўжо вам не цікава пабываць на Поўначы? Там такое сонца! Праўда, раз у год, затое пяць месяцаў запар! І азёры...

— Няма часу нам, Кузьма Іванавіч, азёрамі мілавацца! Вы мне такое месца прапануйце, такое...

— Куды ж вы жадаеце?

— Мне б што-небудзь глухое, запаведнае! Дзе паветра няма, дыхаць цяжка! Дзе б лапа мядзведзя не ступала. Туды, дзе з хаты выйдзеш — і прапаў, згубіўся! Дзе...

— Ну, не, Пятроў, у нашу лабараторыю мы вас размеркаваць не зможам!

* * *

— Учора паралельную групу размяркоўвалі!

— Ну і як?

— Палову на поўнач, а палову — на поўдзень паслалі.

— Ну і як? Задаволены?

— Каго на поўнач — тыя задаволены, а каго на поўдзень — тыя не вельмі.

— Дзіўна!

— Нічога дзіўнага. Адных — на поўнач Крыма, а іншых — на поўдзень Камчаткі!

— ?!

А. ЗОРЫН,
В. ЧУЕЎ.

У ТВОРЧАЙ ЛАБАРАТОРЫІ

## Шэдэўр пра шэдэўр

Рабая попельніца накрылася жменяй яшчэ цёплых акуркаў і драмала. Аловак пасвістваў над аркушам паперы.

За гэтую кароткую ноч я выпусціла з-пад свайго пяра каля дзесяці шэдэўраў. Яны ішлі непарыўным ланцугом.

Шэдэўр № 11, зморшчыўшыся ад галаўнога болю, зацягнуўся гродзенскім «Космасам» і весела падміргнуў мне. І сам пайшоў у кашолку.

Муза — рыхлая жанчына з буйным носам — завітала перад світанкам.

— Нядрэнна б шклянку гарбаты, а? — няўпэўнена прапанавала яна.

Я маўчала. Муза ўздыхнула:

— Ну што ў цябе яшчэ?

...Рыпучым смехам смяялася попельніца. Аловак качаўся па сталу, схапіўшыся за жывот. Пусціўшы слязу месяц за вакном уцёрся хмаркай...

Муза ўздыхнула і сумна паглядзела на дзверы:

— Пегас галодны... Апалон чакае... Ведаеш, а мне сёння яшчэ да Бураўкіна...

Ужо за ганкам азірнулася:

— Ты гэта... не вельмі. Усе калісьці пачыналі.

Наступны шэдэўр з-пад свайго пяра я не выпусціла.

І. ДЗЯРГАЧ



АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА КОНКУРС

на лепшы подпіс да здымка, зробленага выпадкова нашым фотакарэспандэнтам С. ПЛЫТКЕВІЧАМ. Подпісы накіроўваць у рэдакцыю ў пісьмовым выглядзе ці па тэлефоне 20-68-27.

З КІМ НЕ БЫЛО!

## Дыстанія

Заснуў Ён, як звычайна, хутка. Уладкаваўся пазручней, расслабіўся... І раптам гэтыя жахі.

— Аператар адлюстроўвае замкнутае ў банахавай прасторы, мноства ў сябе..,— пачуўся нечы манатонны голас і данесліся царкоўныя спевы.

«А божачкі!»,— падумаў Ён і перавярнуўся на другі бок. Сон стаў неспакойным.

— Запомні, «Дынама» (Мінск) прайграе «Шахцёру» і «Металісту»,— пераконваў Яго даверальны шэпт. Спевы спыніліся. Ён бег па праваму боку. Услед неслася:

— Пастух!

«Трэба прачнуцца»,— падумаў Ён, але зноў пачуў спевы:

— З умоў сціскання аператара выцякае непарыўнасць, сапраўды...

— Добры фасон сукенкі,— нечакана прапішчаў высокі голас, забіваючы царкоўныя спевы.— Паглыбленая пройма, шырокі рукаў з бантам...

— Але самае цікавае,— поўз шэпт,— «Дынама» (Масква) праб'ецца ў «тройку»!

Ён стаяў на п'едэстале ў банахавай прасторы ў чырвоным двубортным пінжаку з падплечыкамі з адзінаццатым нумарам на спіне. Вакол гудзеў стадыён. Дзесьці побач свіснуў суддзя.

Ён адкрыў вочы. Звінеў званок. Лекцыя скончылася.

В. МАЛЮГІН.

НА САМАЙ СПРАВЕ

## ДЫПЛОМ

Лекцыя была бясконцая і сумная. Не толькі таму, што выкладчык бубніў сабе нешта пад нос, але і таму, што была яна з апошніх. У хуткім часе наступала прыемная пара ў жыцці кожнага студэнта-завочніка — чатырохмесячны адпачынак, за які яшчэ і плацяць. Хоць ён і называўся пераддыпломным, завочнікам было незразумела — навошта ім даецца столькі часу, бо за шэсць гадоў яны добра напрактыкаваліся пісаць работы любога аб'ёму за некалькі дзён.

Думкі аб гэтых чатырох месяцах прыемна расслаблялі і весялілі. Раптоўна ў млявых радах прайшла хваля ажыўлення. Нехта прыдумаў дзіўнае, на першы погляд, пытанне і пусціў паперку з ім па аўдыторыі.

«Вам дазволілі абраць вольную тэму дыплома (абсалютна любую). Пра што вы зрабілі б сваё даследаванне?»

Адказы:

«Дыплом пра тое, як можна шэсць гадоў нічога не вучыць і урэшце атрымаць яго дзякуючы сваёй прыгажосці, у прыватнасці, прыгожым вочкам».

«Дыплом пра тое, як я дагэтуль так і не прыдумаў, на які цвік я яго павешу — бо па спецыяльнасці ўладкавацца не змог».

«Дыплом пра тое, колькі гадоў прыйдзецца мне збіраць на прыстойную зімовую вопратку, калі я ўладкуюся з ім па спецыяльнасці».

«Дыплом пра тое, чаму я такі дурань. Бо калі б я не быў у юнацтве ўзрушаным рамантыкам — прыслухаўся б да таго, што раілі бацькі, а раілі яны мне паступаць у наргас».

«Дыплом пра тое, што не ў ім справа. Гэта я зразумеў, правучыўшыся ва універсітэце не болей не меней, як 14 гадоў».

«Дыплом пра тое, чаму лепш мець яго адзін, чым сем пядзей на лоб».

Выкладчык, хоць і бубніў сабе пад нос, звярнуў увагу, што нешта адбываецца не пад яго ўплывам. Ён перахапіў паперку, уважліва, пасміхаючыся, прачытаў яе і прамовіў:

«Таварышы, вельмі добра, што вы так самакрытычна ставіцеся да сабе. Але мне здаецца, вы страцілі пільнасць: дыпломы ж яшчэ не ў вашых торбах, а ў нашых сейфах. Да слова, забыўся вам сказаць: у гэтым годзе мне выпала пачэснае права ўзначальваць экзаменацыйную камісію па спецпрадмету. Вось там і абмяркуем: ці патрэбны вам дыплом».

А. ПАДЭРНА

## Для несмяян і несмяянаў

Паважаны чытач! Калі ў цябе не падняўся настрой пасля чытання нашай першакрасавіцкай старонкі, мы маем яшчэ адзін шанс развесяліць цябе.

Уключы, калі ласка, у разетку прас, і калі ён нагрэецца, добра прапрасуй месца, выдзеленае рамкай. І ты ўбачыш тое, што намаляваў наш мастак сімпатычным чарнілам. Спадзяемся, што пабачанае выклікае ў цябе ўсмешку.

ЗАЎВАГА. Бракаваныя нумары абменьваюцца да канца тыдня.

## У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

### ЦІКАВАЯ СПРАВАЗДАЧА

Вельмі падрабязную справаздачу аб сваіх прагулах прадставіў у дэканат студэнт А. Папоў. Толькі за апошні месяц у яго два разы гарэў дом. Тройчы ўзрываліся балоны з газам. Пяць разоў прарывала вадаправод. І шэсць разоў трамвай сыходзіў з рэек.

### КАРЫСНА ВЕДАЦЬ

Выкладчыкі, якія раней прыходзілі ў інтэрнат з пячэннем, цяпер будуць прыходзіць з варэннем.

### СЕСІЯ НАБЛІЖАЕЦЦА

У час здачы заліку па фізічнай культуры студэнт Самсанюк на 12 мінут палепшыў сусветны рэкорд у лыжнай гонцы на 10 км. Рэкорд не быў зарэгістраваны, бо Самсанюк забыў дома залікоўку.

### НОВЫ РЭКОРД

Новы рэкорд у рыўку паставіў студэнт другога курса Луцікаў. Адной левай ён вырваў з падручніка фізікі 14 старонак. Рэкорд зафіксаваны ў інстытуцкай бібліятэцы.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
31 сакавіка
Зак. 1616.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.